*Дадатак 5*

***БЕЛАРУСКАЕ ГІСТАРЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА***

**ГІСТАРЫЧНЫ АЛЬМАНАХ Том 11. 2005**
**Навуковы гістарычны і краязнаўчы часопіс**

**У ТОМЕ**
**Матэрыялы Міжнароднага навуковага семінара "Другая сусветная вайна ў калектыўнай памяці беларусаў, літоўцаў, палякаў"**



***Скрынскі Пётр Іванавіч,***
*в.Велямічы Столінскага раёну*
*Берасцейскай вобл.*

# З успамінаў партызана*

На Мерлінскіх хутарах партызаны з'явіліся ў лістападзе 1942 г. Адкуль яны прыйшлі і дзе жылі было невядома. Яны прыходзілі да людзей выключна ўначы, што-небудзь забіралі і адыходзілі ў невядомым накірунку. На працягу лістапада яны пяць разоў былі ў нас, і кожны раз пасля гэтага мы хадзілі ў сельскую ўправу ў Колбікі заклад-

Пётр Іванавіч Скрыпскі нарадзіўся ў Мерлінскіх хутарах (20 км на поўдзень ад Давыд-Гарадка) на Палессі 23 лістапада 1920 г. Сям'я была вялікая. Маці нарадзіла 16 дзяцей. Пётр быў малодшым. Закончыў пачатковую школу і марыў працягваць навучанне, каб стаць ксяндзом. Аднак перашкодзіла вайна. 1939 г. быў пераломным у ягоным жыцці. Мары былі расстраляныя нямецкімі і савецкімі войскамі, якія ў верасні 1939 г. сумесна знішчалі польскую дзяржаву. Праз два гады на Палессі з'явіліся ўжо нямецкія акупанты.

У кастрычніку 1943 г. П.І.Скрыпскі пайшоў добраахвотнікам у партызанскі атрад, а ў 1944 г. ужо ваяваў у рэгулярных частках Чырвонай арміі. Быў паранены і дахаты вярнуўся без правай рукі. Пасля вайны працаваў начальнікам паштовага аддзялення спачатку ў Мерлінскіх хутарах, а пазней у вёсцы Велямічы. Меў аўтарытэт і карыстаўся павагай людзей. Самастойна вывучаў расейскую мову, шмат чытаў і рабіў выпіскі з прачытанага. Памёр у верасні 2005 г., пакінуўшы вялізную бібліятэку і чатыры рукапісы разважанняў і ўспамінаў на расейскай мове.

Вядомы варшаўскі этнолаг Ганна Энгелькінг увосень гэтага году перадала ў рэдакцыю ягоны рукапіс *Роздум пра мінулае і сучаснае*. Рукапіс аказаўся даволі цікавым, і рэдакцыя вырашыла апублікаваць яго фрагменты. З дазволу Марыі Ульянаўны Скрыпскай быў падрыхтаваны да друку "партызанскі" фрагмент успамінаў. Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову.

пізаваных конях, часцяком за самагон пакідалі якога-небудзь захудалага коніка гаспадару […]

Для мясцовага насельніцтва наступіў трывожны час. Партызаны то прыходзілі, то знікалі. На ўсходзе праз былую мяжу было відаць полымя пажараў. Удзень дымавыя аблокі закрывалі палову неба. Дайшлі звесткі, што спаленыя вёскі Тонеж і Слабада. Пры гэтым і карнікі неслі страты. Партызаны з засады знішчылі іх некалькі дзесяткаў. Некаторыя сем'і мерлінцаў пайшлі жыць у лес, тыя, што жылі пры дарозе, перабраліся да суседзяў з "цішэйшых" мясцінаў. Некаторыя з'ехалі ў вёскі.

Найбольш пастрадала вёсачка Рубрын. Альбо таму, што каўпакаўцы пасля боя ў Бужы прайшлі праз яе ўсёй армадаю, альбо таму, што сярод раскіданых хутароў на ўвесь раён гэта было адзінае, хоць і невялікае ў 30 двароў, пасяленне, але Рубрын перажыў шмат чаго. 27 студзеня 1943 г. тут вялі бой партызаны з карнікамі. Потым дзве карныя экспедыцыі цалкам спалілі вёску. Да таго ж яна яшчэ і падвяргалася бамбардзіроўкам з паветра. Партызаны, што знаходзіліся ў глыбокім нямецкім тыле і не мелі баз снабжэння, не маглі весці працяглых баёў. Яны маглі біць ворага з засады або наносіць немцам страты, дзякуючы нечаканым ударам. 27 студзеня пасля перастрэлкі партызаны адступілі. Карнікі маглі без пакарання рабіць сваю "чорную справу" – паліць будынкі і забіць людзей, якія не здолелі схавацца. Былі забітыя Іван Паўлавіч Масло, Браніслаў Масло, Аляксандр Кірылавіч Рафаловіч, Масло Варвара (маці), Броня і Леанід Паўловічы (дзеці), Сцяпан Аляксандравіч Масло (бацька), Кацярына Адамаўна (маці), Аляксандр, Мальвіна і двое малых дзетак. Усяго 12 чалавек.

Масло Іван Паўлавіч разам з Рафаловічам Аляксандрам, былым леснікам, падчас боя хаваліся на беразе р.Ствігі. Калі бой заціх і ў паветра пачаў ўздымацца дым пажараў, Масло са словамі *Не вытрымаю, пайду прасіць, каб не палілі хату!* падняўся на ногі, і ў гэты самы момант быў застрэлены напавал і пакаціўся ўніз. Браніслаў Масло ў Першую сусветную вайну быў у нямецкім палоне. Некаторае веданне нямецкай мовы давала надзею знайсці паразуменне з карнікамі... Загінуў.

Вёска была спаленая. Застаўся толькі касцёл, плебанія, тры хаты і сарай. Пасля партызанскай начоўкі ў кожнай хаце на падлозе ляжала сена або салома, на якіх спалі партызаны. Гэтую падсцілку карнікі выкарыстоўвалі для падпальвання. У адной хаце гаспадар хаваўся пад падлогай, дзе ляжала бульба. Тройчы ў хату заходзіў карнік і падпальваў падсцілку, тройчы гаспадар пасля яго адыходу вылазіў з хованкі і гасіў полымя. Так выратаваў сваё жытло. У тым бое быў паранены ў руку Шымон Рафаловіч, які начаваў потым у Мерліне ў Міхася Кіселя. Праз год з

Кароціч прайшла ў Рубрын на Колкі чарговая карная экспедыцыя. Па дарозе карнікі спалілі ўсе ацалелыя пабудовы ў Рубрыне і некалькі двароў (Цупікаў) за ракою. Чалавечых ахвяраў не было. Усе схаваліся ў лесе. На жаль, той факт, што вёска Рубрын была цалкам знішчаная і загінулі некаторыя яе жыхары, не адзначаны ў Хатыні і не згаданы ў савецкай беларускай энцыклапедыі.

*Заўвага 1*. У арыгінале рукапісу, копію якога я маю, аўтар піша “Аляксандр**а**” Масла, г. зн. дзяўчынка, а не “Аляксандр”, як памылкова надрукавана тут.

*Заўвага 2.* Пра давер да ўспамінаў П. Скрыпскага ў цэлым. Былыя жыхары Рубрына і Мерліна І. С. Масла, І. М. Вячорка, І. І. Дзямешка, успамінаючы пра яго, аднадушныя ў ацэнках: вельмі інтэлігентны, далікатны, уважлівы, пунктуальны, сумленны чалавек. І. С. Масла дадае: “Такіх людзей я ў сваім жыцці больш не сустракаў”. І ўспамінае: “Пасля вайны мы ж былі зусім маладыя, вечарамі хадзілі на музы́кі (танцы). Калі вярталіся дадому, была ўжо амаль ноч, а на пошце ўсё яшчэ гарэла святло, Пётр Іванавіч нешта ці чытаў, ці пісаў”.

*А. Вячорка*